Экалагічнае становішча

Ваўкавыскі раён размешчаны ў межах Ваўкавыскай ўзвышшы, што прадвызначае адсутнасць на тэрыторыі раёна вялікіх і сярэдніх рэк. Рачная сетка прадстаўлена ручаямі, вытокамі і вярхоў'ямі рэк, якія адносяцца да басейна ракі Нёман. Агульная працягласць рэк на тэрыторыі раёна складае 354 км. На тэрыторыі Ваўкавыскага раёна размешчаны 24 натуральных і штучных вадаёма, якія выкарыстоўваюцца для культурна-бытавых і рыбагаспадарчых мэтаў. Арганізавана 5 месцаў (пляжаў) масавага адпачынку насельніцтва (вадасховішча «Дамба» г. Ваўкавыск, санаторый «Пралеска» г.п. Краснасельскі, вадасховішча «Хацькоўцы» в. Хацькоўцы, вадасховішча « Воўпа » в. Кавалі, вадасховішча а. г. Вярэйкі) . На тэрыторыі раёна ўсе аб'екты, якія могуць уплываць на якасць вод, вынесены за межы водаахоўных зон водных аб'ектаў. Арганізаваны і праводзіцца лакальны маніторынг, аб'ектам назірання якога з'яўляюцца скіды сцёкавых вод і паверхоўныя воды. Выпрабаванні ажыццяўляюцца акрэдытаванай лабараторыей КУП «Ваўкавыская камунальная гаспадарка". На тэрыторыі Ваўкавыскага раёна маюцца асаблівыя ахоўныя прыродныя тэрыторыі: рэспубліканскі біялагічны заказнік «Замкавы лес», геалагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння «агаленне « Рось » і помнік прыроды мясцовага значэння старадаўняе дрэва - дуб. На тэрыторыі раёна перададзена пад ахову 31 месца вырастання дзікарослых раслін і 6 месцаў пражывання дзікіх жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. На тэрыторыі Ваўкавыскага раёна знаходзіцца 25 буйных прамысловых прадпрыемстваў і арганізацый, якія ажыццяўляюць выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра. Валавы выкід забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных крыніц выкідаў у сярэднім за год складае 10-12 тысяч тон. Асноўным забруджвальнікам атмасфернага паветра ў Ваўкавыскім раёне з'яўляецца ААТ «Краснасельскбудматэрыялы», валавы выкід забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных крыніц выкідаў якога складае парадку 72% ад усіх выкідаў па раёне.

Пастаянна праводзіцца аналітычны кантроль і лакальны маніторынг выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад

стацыянарных крыніц выкідаў, якія паказваюць адсутнасць перавышэння дапушчальных нарматываў выкідаў, усталяваных тэхнічнымі нарматыўна-прававымі актамі.

Значны ўклад у ачыстку атмасфернага паветра ад пылу ўносяць зялёныя насаджэнні. Агульная плошча азелянення тэрыторыі горада Ваўкавыска складае 370,93 га, з іх на 1 жыхара горада Ваўкавыска даводзіцца-8,41га.

На тэрыторыі раёна маецца адзін гарадскі палігон цвёрдых камунальных адходаў «Азярыска» і 12 міні-палігонаў для пахавання цвёрдых камунальных адходаў. У сярэднім за год на дадзеных палігонах размяшчаецца парадку 142 тысячы тон адходаў.

Для арганізацыі збору і вывазу камунальных адходаў Ваўкавыскім раённым выканаўчым камітэтам зацверджана схема абыходжання з камунальнымі адходамі, якi ўтвараюцца на тэрыторыі горада Ваўкавыска. У горадзе Ваўкавыску ажыццяўляецца 100% ахоп насельніцтва планава-рэгулярнай санітарнай ачысткай, а так сама, раздзельным зборам камунальных адходаў.

У рэестры аб'ектаў па выкарыстанні адходаў у Ваўкавыскім раёне зарэгістраваны кар'ер радовішча пясчана-гравійнай сумесі «Скураты», уласнікам якога з'яўляецца ААТ «Ваўкавыскае рамонтно-будауничае прадпрыемства №1», і кар'ер радовішча пяску і пясчана-гравійнай сумесі «Дзякі», уласнікам якога з'яўляецца Ваўкавыскае ААТ «Будаўніча-мантажны трэст №32», якія выкарыстоўваюць для рэкультывацыі кар'ераў будаўнічыя адходы. Арганізацыі выкарыстоўваюць ўласныя адходы вытворчасці і прымаюць ад іншых арганізацый.